# ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ДЛЯ МАЛАДОГА ПАКАЛЕННЯ

*Яфімчык А.І*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г.Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Наўроцкая І.В. – старшы выкладчык*

Было праведзена агляднае даследаванне сервісаў, якія ў інтэрактыўнай форме могуць дапамагчы ў вывучэнні беларускай мовы. Сярод выбаркі сэрвісаў і дадаткаў быў зроблены падзел на адукацыйныя і забаўляльныя.

Маўленчае развіццё дашкольнікаў (і не толькі) у Беларусі адбываецца ў спецыфічнай сацыялінгвістычнай сітуацыі руска-беларускага блізкароднаснага двухмоўя (білінгвізму). Для большасці гарадскіх дзяцей першай мовай, на якой яны вучацца гаварыць і думаць, мець зносіны, з’яўляецца руская мова, а беларуская выступае для іх як другая. У сувязі з гэтым актуальным нам бачыцца прадставіць апісанне наяўных праектаў, якія спрыяюць папулярызацыі беларускай мовы, стымулююць яе выкарыстанне і развіццё, павышаюць цікаваць да нацыянальнай мовы.

На пачатак 2022 г. намі вылучаны каля 5 праектаў, якія мы кваліфікуем як адукацыйныя і забаўляльныя (гульнёвыя). Прывядзём прыклады адукацыйных праектаў.Так, да адукацыйных праектаў можна аднесці праект кампаніі А1 «Першыя», які падтрымлівае новыя ідэі ад вучняў 9-х, 10-х і 11-х класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі па наступных кірунках:

- экалогія,
- тэхналогіі,
- інклюзія,
- культура,
- урбаністыка.

Па інфармацыі з сайта праекта: «Першыя» – конкурс ідэй, з дапамогай якіх можна змяніць навакольны свет, грамадства ці жыццё людзей да лепшага. Прыняць удзел могуць. А таксама гэта карысныя майстар-класы і інтэрактыўныя воркшопы з сапраўднымі прафесіяналамі сваёй справы. 10 фіналістаў праекта стануць галоўнымі спікерамі маштабнай моладзевай канферэнцыі TEDxYouth@Minsk і атрымаюць смартфоны»[1].

Да ліку адукацыйных праектаў мы адносім мабільны дадатак «Мова прафесіі» ад кампаніі SAY.BY, якая дазволіць трэніраваць, практыкавацца і пацвярджаць веды гутарковай беларускай мовы сваёй прафесіі і нават атрымліваць сертыфікат, падобны на тыя, што існуюць для замежных моў (аналаг TOEFL, IELTS, PTE). Праект накіраваны на ўкараненне беларускай мовы ў карпаратыўную культуру, каб супрацоўнікі кампаній выдатна разумелі, а яшчэ лепш – размаўлялі па-беларуску з кліентамі кампаніі і пры асабістых зносінах з калегамі [2].

Заўважым, што SAY.BY – гэта платформа падтрымкі жывой беларускай мовы. Асноўнымі для карыстальніка з'яўляюцца сайт і мабільны дадатак, на якіх сэрвіс дазваляе не толькі адшукаць беларускамоўныя месцы побач, але і атрымаць "зніжку за мову" на розныя тавары і паслугі.

Уладальнікам бізнеса аўтары даюць магчымасць выказваць падтрымку роднай мовы, прываблiваць беларускасцю новых кліентаў і ператвараць іх у сталых. А беларусам - магчымасць размаўляць на роднай мове [3]. Скрыншоты мабільнага дадатку, якія складаюць уяўленне пра яго работу, прыведзены на малюнку 1.



Малюнак 1. Скрыншоты мабільнага дадатку праекта «say.by»: меню з выбарам актыўнага размоўніка; месцы-партнёры, у якіх персанал размаўляе на беларускай мове; пошук слова у катэгорыі «Вітанні».

Да прыкладаў забаўляльных праектаў адносіцца навучальны, развіццёвы Youtube-канал “Бэйбус”, які зроблены з мэтай адукацыі і папулярызацыі беларускай мовы сярод дзяцей і немаўлят. Як адзначаюць аўтары праекта, канал створаны з клопатам і павагай, з пяшчотай і весялосцю. Бэйбус – гэта жыццярадасны дапытлівы герой [4].

«CINEVOKA – кіно па-беларуску» - забаўляльны праект відэасэрвісу VOKA па папулярызацыі беларускай мовы сярод аматараў кінематографа. Фільмы і мультфільмы перакладаюцца і агучваюцца ў прафесійным шматгалосым дубліраванні з удзелам вядомых беларускіх аўтараў, акцёраў, вядучых, дыктараў і музыкаў [5]. На малюнку 2 прыведзены скрыншот галоўнай старонкі праекта:




Малюнак2. Скрыншот галоўнай старонкі праекта «CINE-VOKA»: прыведзены каталог перакладзеных на беларускую мову фільмаў і мультфільмў

У цяперашні час актыўнага выкарыстання інфармацыйных тэхналогій можна вывучаць мову амаль што любой краіны, і беларуская тут не выключэнне. Такія праекты як «say.by», «Бэйбус», «Мова.про» і інш. дапамагаюць сучаснаму беларусу паглыбіцца ў вывучанне роднай мовы у больш усвядомленным узросце і рабіць гэта ў вельмі інтэрактыўнай форме.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***


1. *Інфармацыйны партал кампаніі А1 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.generation.a1.by/ .- Дата доступу: 10.03.2022.*
2. *Інфармацыйны партал праекта «Мова прафесіі» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://say.by/pro - Дата доступу: 10.03.2022.*
3. *Інфармацыйны партал праекту «Say.by» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://say.by - Дата доступу: 10.03.2022.*
4. *Старонка парталу «Baybus» на відэахостінгу YouTube [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу:https://www.youtube.com/c/baybusby - Дата доступу: 10.03.2022.*
5. *Старонка «Cinevoka» на відэасервісу VOKA.TV [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://voka.tv/movies-?quick_filter_ids_include=belorusskie - Дата доступу: 10.03.2022.*